УДК 37.026.9:130.2

# ПРАБЛЕМА ТВОРЧАСЦІ Ў ФІЛАСОФСКА-КУЛЬТУРАЛАГІЧНЫМ РАЗУМЕННІ

***В. М. Белакурскі,***
*кандыдат філасофскіх навук, дацэнт, дацэнт кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»;*

***Ж. Я. Белакурская,***
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт, дацэнт кафедры міжкультурных камунікацый і рэкламы ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

**Анатацыя.** У артыкуле даследуецца катэгорыя творчасці ў кантэксце філасофскіх, культуралагічных, псіхалагічных ведаў, даецца аналіз трактовак дадзенага паняцця ў працэсе эвалюцыі культуры і гістарычнага развіцця навукі. Аўтарамі рэалізавана спроба аналітыка-сінтэтычнага падыходу да разгляду творчага працэсу з антычнага часу да нашых дзён. Гэта прадугледжвае ўстанаўленне сувязей творчасці з асноўнымі сацыяльнымі з'явамі, якія вызначаюць яго існасць. Базавымі ў рамках дадзенай сістэмы адносін выдзяляюцца адносіны да дзейнасці.

**Ключавыя словы:** творчасць, навука, мастацтва, філасофія, культуралогія, веды, канцэпцыі творчасці, свабода, ірацыянальнае, тэорыя творчасці, камунікацыйныя тэхналогіі.

# THE PROBLEM OF CREATIVITY IN THE PHILOSOPHICAL AND CULTURAL UNDERSTANDING

***V. Belakurski,***
*PhD in Philosophy, Associate Professor, Associate Professor of the Department of Social and Humanitarian Disciplines of the Educational Institution «The Belarusian State University of Culture and Arts»;*

***Z. Belakurskaya,***
*PhD in Philology, Associate Professor, Associate Professor of the Department of Intercultural Communications and Advertising of the Educational Institution «The Belarusian State University of Culture and Arts»*

**Abstract.** The article examines the category of creativity in the context of philosophical, cultural, and psychological knowledge, and provides an analysis of the interpretations of this concept in the process of cultural evolution and historical development of science. The authors have implemented an attempt of an analytical and synthetic approach to the consideration of the creative process from ancient times to the present day. This presupposes the establishment of links between creativity and the main social phenomena that determine its essence. Basic within the framework of this system of relations are the relations to activity.
**Keywords:** creativity, science, art, philosophy, cultural studies, knowledge, concepts of creativity, freedom, irrational, theory of creativity, communication technologies.

Адным з паказчыкаў сацыяльнай значнасці чалавека з’яўляецца яго здольнасць да творчасці. Творчасць як філасофскае і культуралагічнае паняцце выражае галоўны сэнс чалавечай дзейнасці, накіраванай на яе разнастайнасць, а таксама найважнейшы аспект самаразвіцця асобы. Дынаміка сучаснага грамадства выклікае патрэбу ў крэатыўных людзях, якія могуць не толькі паспяхова арыентавацца ў крызісных абставінах, але і знаходзіць варыянты іх нетрывіяльных рашэнняў. Таму даследчыкі ўсё больш засяроджваюць увагу на праблеме «экалогіі творчасці», якая арыентавана на свядомае кіраванне крэатыўнымі працэсамі ў розных сферах грамадскага жыцця.

Праблема творчасці пачала займаць чалавека са старажытных часоў. Платон і Арыстоцель дастаткова грунтоўна прааналізавалі такія элементы творчага працэсу, як натхненне, майстэрства, прыродныя здольнасці, тэарэтычныя веды, вопыт і інш. Мысліцелі Сярэднявечча (А. Аўгусцін, Ф. Аквінскі) разгледзелі некаторыя аспекты творчай дзейнасці, вылучаючы самасвядомасць як духоўны стрыжань асобы, а розум і волю як яе атрыбуты. У эпоху Адраджэння М. Кузанскі пачаў суадносіць сэнс творчасці з ідэяй чалавека як «мікракосму». У працах філосафаў Новага часу (Ф. Бэкан, Р. Дэкарт) акцэнт паступова перамяшчаецца ў сферу навуковай творчасці. Нямецкімі мысліцелямі-класікамі (І. Кант, Г. Гегель) чалавек пачаў разглядацца як суб’ект творчай дзейнасці. Тэарэтычна спелая распрацоўка дадзенай ідэі знойдзе месца ў працах К. Маркса і Ф. Энгельса. Прадстаўнікі філасофскага ірацыяналізму XIX ст. (А. Шапенгауэр, Ф. Ніцшэ) падыходзілі да творчага працэсу як да своеасаблівага эстэтычнага феномена, які дапамагае чалавеку набыць сэнс свайго існавання ў свеце.

У шэрагу філасофска-культуралагічных канцэпцый творчасці XX–XXI стст. апошняя супрацьпастаўлялася паўсядзённай механічнай працы; звязвалася з дзейнасцю чалавека па перабудове свету на аснове аб’ектыўных законаў; са станам экстазу; з ірацыянальным пачаткам свабоды; з інтэлектуальным сузіраннем інды-

віда. Напрыклад, М. А. Бярдзяеў лічыў, што творчыя здольнасці закладзены ў чалавеку як працяг у ім боскага, таму менавіта творчасцю чалавек здольны апраўдаць сваё з'яўленне і існаванне ў свеце [1]. Ж. Марытэн даводзіў, што творца не раскрывае ў сваім творы ні самога сябе, ні свет, а «вывяргае» ў твор «асабістыя комплексы і атруты, пачынаючы тым самым своеасаблівы курс свайго псіхіятрычнага лячэння» [5, с. 182].

У постмадэрнісцкіх канцэпцыях другой паловы XX ст. (Ж. Бадрыяр, Ж. Дэлёз, Ф. Гватары) творчая дзейнасць паступова стала зводзіцца да праблемы сімулякра. Напрыклад, Ж. Бадрыяр даводзіў аб замене творчага працэсу сімулятыўным дзеяннем, якое выцясняе крэатыўнасць індывіда. Адзначым, што паняцце «сімулякр» упершыню сустракаецца ў лацінскіх перакладах Платона, дзе азначае такія паняцці, як прывід, адлюстраванне, не адпавядаючае арыгіналу, копія і г. д. Паводле Ж. Бадрыяра, сімулякры – умоўныя знакі, якія існуюць у грамадстве замест рэальных рэчаў. Ён вылучаў тры ўзроўні сімулякраў і адпаведна тры этапы іх станаўлення. Сімулякры першага ўзроўню – тыя падробкі, якія суадносяцца з арыгіналам і дзейнічаюць на аснове натуральнага закона каштоўнасці. У сімулякраў другога ўзроўню галоўным выступае немагчымасць іх адрознення. На трэццім узроўні сімуляцыя – штучная знакавая рэальнасць, якая не мае ніякіх рэальных правобразаў. Аўтар падкрэсліваў, што самым небяспечным з'яўляецца менавіта страта адрознення паміж рэальнасцю і сімулякрам. На гэтай падставе ён сцвярджаў, што творчая дзейнасць чалавека ў сучасным грамадстве немагчыма. «Такая сітуацыя склалася ў сувязі з тым, што ў кожным са складнікаў страчаны крытэрыі адрознення творчасці ад "вечнага звароту"» [2, с. 11]. Чалавек як суб'ект творчасці вычарпаў свае магчымасці ва ўсіх сферах дзейнасці. Зніклі мінулыя ідэалы, каштоўнасці, жыццёвыя сэнсы. Прадметы і з'явы аб'ектыўнай і суб'ектыўнай рэальнасці, прызначаныя быць правобразамі творчага працэсу, замянілі знакі. Канчатковы вынік уяўляе сабой перапрацоўку і камбіраванне ўжо існуючага.

Крыху інакш да творчага працэсу падыходзіў Ж. Дэлёз: «…у навуцы, як у філасофіі ці мастацтве, прысутнічае творчасць <…> у навуковых сістэмах існуюць асабовыя "стылі" – не як знешняя рыса, а як адзін з параметраў іх стварэння, пры гэтым яны нават сутыкаюцца з некаторым вопытам перажыванняў» [3, с. 207]. На думку аўтара, у мастацкай дзейнасці крытэрый творчага працэсу – гэта ўменне мастака стварыць такі твор, які ўяўляе сабой «сутнасць адчування».

Нягледзячы на шматлікія філасофскія і культуралагічныя падыходы, у сучаснай навуцы не існуе адназначнай інтэрпрэтацыі паняцця «творчасць», пытанні вызначэння крытэрыяў творчай дзейнасці чалавека застаюцца адкрытымі. Сярод розных ідэй сучасных даследчыкаў неабходна вылучыць дзве асноўныя інтэнцыі. Па-першае,

творчасць разглядаецца як працэс мэтанакіраванай дзейнасці чалавека па стварэнні новага і перабудове існуючага. Італьянскі навуковец А. Дзікікі дае характэрнае для такога падыходу вызначэнне: «Творчасць – гэта здольнасць генерыраваць штосьці такое, што раней ніколі не было вядомым, не сустракалася і не назіралася» [4, с. 17]. Па-другое, творчасць разглядаецца як рэалізацыя патэнцый, закладзеных у існасці. Чалавек выконвае ў гэтым выпадку ролю пасрэдніка, не ўсведамляючы сябе ў якасці «пакладзенага ў аснову» суб’екта, які дэтэрмінуе мэты, задачы і вынікі стваральнай дзейнасці.

Адзначым, што галоўныя напрамкі сучасных даследаванняў творчай дзейнасці на Захадзе носяць прыкладны, утылітарны характар. Гэта дае магчымасць забяспечыць даследчыкаў матэрыяльнымі рэсурсамі і дазваляе ім выкарыстоўваць сучасныя інфармацыйныя і камунікацыйныя тэхналогіі, пашыраючы сферы ўплыву выпрацаваных канцэпцый на грамадства і яго інстытуты. Галоўным вынікам такіх даследаванняў, на думку амерыканскага вучонага Г. Рагга, павінна стаць стварэнне цэласнай тэорыі творчасці, якая будзе: а) ахопліваць усю псіхіку чалавека, як свядомае, так і бессвядомае; б) прызнаваць адзінства псіхічнага і фізічнага; в) засяроджваць увагу на аналізе свабодна-асацыятыўнага мыслення ў падсвядомай сферы; г) прызнаваць ролю інтуітыўнага і лагічнага ў атрыманні адэкватных ведаў, не атаясамліваючы творчы працэс з рашэннем простых задач; д) прадвызначаць дамінаванне ў ім пачуццёвага мыслення, а таксама ідэнтыфікацыю апошняга з аналізуемымі з’явамі ў момант творчага акту; е) улічваць зменлівы характар працэсаў у цэнтральнай нервовай сістэме; ж) прызнаваць уплыў на працэс творчасці як унутраных, так і знешніх стымулаў [6, с. 62].

Прадстаўлены матэрыял дазваляе зрабіць наступныя вывады:

– існуючая шматдысцыплінарнасць і поліварыянтнасць вывучэння творчасці абумоўлівае неабходнасць паняццевага падзелу суб’ектна-асобавага і сацыякультурнага аспектаў гэтага феномена;

– развіццё і шырокае выкарыстанне сучасных інфармацыйных і камунікацыйных тэхналогій фарміруюць новую парадыгму існавання чалавека ў свеце татальных камунікацый, якія не толькі выклікалі да жыцця новыя формы творчасці, але і змянілі ўяўленне аб самой творчасці і яе суб’екце;

– творчасць як здольнасць да нараджэння новага і арыгінальнага ўзнікае толькі ў рэчышчы сацыяльных камунікацый.

1. *Бердяев, Н. А.* Философия свободы. Смысл творчества / Н. А. Бердяев. – М. : Правда, 1989. – 607 с.

2. *Бодрийяр, Ж.* Прозрачность зла / Ж. Бодрийяр. – М. : Добросвет, 2000. – 257 с.

*3. Делез, Ж.* Что такое философия? / Ж. Делез, Ф. Гваттари. – М. : Алетейя, 1998. – 286 с.

*4. Дзикики, А.* Творчество в науке / А. Дзикики. – М. : УРСС, 2001. – 240 с.

*5. Маритен, Ж.* Ответственность художника / Ж. Маритен // Самосознание европейской культуры XX века: мыслители и писатели Запада о месте культуры в современном обществе / [сост. Р. А. Гальцева ; пер. и примеч. С. С. Аверинцев и др.]. – М., 1991. – С. 171–207.

*6. Рагг, Г.* Исследование творчества / Г. Рагг // Вопросы психологии. – 2000. – № 2. – С. 60–71.